вук, зыходзяць з ацэнкі сучаснага стану прыроднага асяроддзя і яго уздзеяння на якасць жыцця чалавека, ролі прыродных сістэм у стабілізацыі глабальных біясферных працэсаў, глабальных і рэгіянальных асаблівасцей узаемадзеяння чалавека і прыроды. На Беларусі прававая аснова Э.д. — Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь; яе асн. палажэнні адлюстраваны ў Нац. стратэгіі устойлівага развіцця Беларусі (1996).

*Літ.*: Коробкин В.И., Передельский Л.В. Экология. Ростов н/Д, 2000; Реймерс Н.Ф. Экология (теории, законы, правила, принципы и гипотезы) // Россия молодая. М., 1994. *В.В.Маўрышчаў.*

**ЭКАЛАГІ́ЧНАЯ ЗБРО́Я**, любы біялагічны, фіз., хім. сродак, які прычыняе матэрыяльныя страты, зніжае абараназдольнасць працаўніка праз змены прыроднага асяроддзя, знішчэнне прыродных рэсурсаў і прыводзіць да пагаршэння здароўя людзей. Можа быць метэаралагічнай (ініцыіраванне моцных атм. ападкаў, разбуральных ураганаў і бур, цунамі, землетрасенняў, лавін і апоўзняў, стымуляцыі вулканічнай дзейнасці) і экасістэмнай (знішчэнне раслінасці на вял. тэрыторыі дэфаліянтамі, тэхн. сродкамі і інш.). Э.з. выкарыстоўваецца ў *экалагічнай вайне*. *В.В.Маўрышчаў.*

**ЭКАЛАГІ́ЧНАЯ КАТАСТРО́ФА**, гл. *Катастрофа* экалагічная.

**ЭКАЛАГІ́ЧНАЯ МАЗАІКА**, частае спалучэнне і чаргаванне розных ландшафтаў і іх структурных падраздзяленняў з вял. колькасцю пераходаў (*экатонаў*) паміж імі. Забяспечвае больш высокую колькасць і шчыльнасць засялення тэр. жывымі арганізмамі, што павялічвае выхад біял. прадукцыі з адзінкі плошчы тэрыторыі.

**ЭКАЛАГІ́ЧНАЯ НІ́ША**, гл. *Ніша экалагічная.*

**ЭКАЛАГІ́ЧНАЯ ПАЛІ́ТЫКА**, 1) палітыка дзяржавы, накіраваная на ахову і аздараўленне навакольнага асяроддзя, рацыянальнае выкарыстанне і ўзнаўленне прыродных рэсурсаў. Уключае захаванне і развіццё сацыясферы, якая забяспечвае нармальную жыццядзейнасць і экалагічную бяспеку чалавека. Э.п. павінна забяспечыць пераход чалавецтва да устойлівага развіцця. На сучасным этапе яна накіравана на захаванне стабільнасці спрыяльных параметраў жыцця. Аснова гэтага — стратэгія устойлівага развіцця, прынятая на канферэнцыі ААН па навакольным асяроддзі (Рыо-дэ-Жанейра, 1992). 2) Сукупнасць асн. прынцыпаў, намераў і абавязацельстваў прадпрыемства (арг-цыі), якія ствараюць аснову для распрацоўкі і устанаўлення уласных экалагічных мэт і задач. Разглядаецца як першасны рухавік працэсу укаранення і развіцця, сродак паляпшэння сістэмы экалагічнага менеджменту ў арганізацыі. Э.п. павінна адлюстроўваць абавязацельствы вышэйшага кіраўніцтва ў адносінах да патрабаванняў заканадаўчых, нарматыўна-тэхн. і інш. актаў і прынцыпы яе паслядоўнага паляпшэння. Э.п. падлягае перыяд. ацэнцы, перагляду ў адпаведнасці са зменамі ў прыродзе і грамадстве і новай інфармацыяй. На Беларусі прававая аснова Э.п. — Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь; яе асн. палажэнні адлюстраваны ў Нац. стратэгіі устойлівага развіцця Беларусі (1996). *В.В.Маўрышчаў.*

**ЭКАЛАГІ́ЧНАЯ ПАРАДЫГМА**, сістэма каштоўных арыентацый і рэгулятараў, у т.л. сукупнасць патрэбнасцей чалавека, накіраваных на захаванне прыроднага асяроддзя. Прадугледжвае гарманічныя адносіны чалавека да прыроднага асяроддзя і сац. наваколля, адносіны да сябе як часткі прыроды, фарміраванне экалагічнай маралі, этыкі, свядомасці ва ўсіх сферах прац. і грамадскага жыцця. Вызначае спосабы узаемадзеяння грамадства з прыродным, гіст. і сац. асяроддзем. Укараненне ў свядомасць чалавека Э.п. — важнейшая задача *экалагічнага выхавання і асветы.* *В.В.Маўрышчаў.*

**ЭКАЛАГІ́ЧНАЯ ПІРАМІ́ДА**, графічная мадэль, якая паказвае суадносіны масы (колькасці, энергіі) прадуцэнтаў, кансументаў і рэдуцэнтаў у *экасістэме*. У *трафічных ланцугах* ч. біямасы выкарыстоўваецца на рост асобіны, а частка трáціцца на дыханне, размнажэнне, рух і інш., таму колькасць біямасы (асобін, энергіі) на кожным наступным *трафічным узроўні* меншая, чым на папярэднім.

**ЭКАЛАГІ́ЧНАЯ РАЎНАВАГА**, гл. *Раўнавага экалагічная.*

**ЭКАЛАГІ́ЧНАЯ ЭКСПЕРТЫЗА**, сістэма комплекснай ацэнкі гаспадарчага або інш. антрапагеннага уздзеяння на навакольнае асяроддзе. Задачы Э.э.: вызначэнне узроўню экалагічнай небяспекі плануемай або ажыццяўляемай гасп. ці інш. дзейнасці, якая можа прама або ускосна паўплываць у цяперашні час ці у будучыні на стан навакольнага асяроддзя і здароўе насельніцтва; праверка адпаведнасці праектуемай дзейнасці патрабаванням *прыродаахоўнага заканадаўства*; вызначэнне дастатковасці і абгрунтаванасці прадугледжаных праектам мер па ахове прыроды. Аб'екты Э.э.: перадпланавая, перадпраектная і праектная дакументацыя; праекты планаў (праграм), асн. кірункаў, схем развіцця і размяшчэння прадукц. сіл і галін нар. гаспадаркі; існуючыя прадпрыемствы, ваен., навук. і інш. аб'екты незалежна ад іх формы уласнасці; экалагічны стан прыродных аб'ектаў, асобных мясцовасцей, рэгіёнаў і населеных пунктаў. Дзярж. Э.э. на Беларусі вядзецца органамі Мін-ва прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ў адпаведнасці з Законам «Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе». *Т.А.Макарэвіч.*

**ЭКАЛАГІ́ЧНАЯ ЭНЕРГЕ́ТЫКА**, 1) атрыманне энергіі з узнаўляльных (энергія ветру, вады, Сонца) ці біял. крыніц. 2) Раздзел *экалогіі*, які вывучае механізмы і эфектыўнасць выкарыстання і пераўтварэння энергіі ў працэсах жыццядзейнасці арганізмаў. Выкарыстоўвае эксперым. метады рэгістрацыі хуткасці і інтэнсіўнасці працэсаў метабалізму, іх энергет. забеспячэння і эфектыўнасці перадачы энергіі па трафічных ланцугах экасістэм. Дазваляе ацаніць маштабы і эфектыўнасць выкарыстання энергіі на рост арганізмаў, дае зыходныя звесткі для пабудовы матэм. мадэляў экасістэм.

**ЭКАЛАГІ́ЧНЫ ПЕ́СІМУМ**, інтэнсіўнасць *экалагічнага фактару* пры якім існаванне арганізма магчыма, але яго жыццядзейнасць максімальна прыгнечваецца.

**ЭКАЛАГІ́ЧНЫЯ РЭСУ́РСЫ**, сукупнасць асяроддзеўтваральных кампанентаў — прыродная энергія, газавы склад атмасферы, вада, глеба, рэльеф, расл. і жывёльны свет. Збалансаванае узаемадзеянне Э.р. забяспечвае *раўнавагу экалагічную* біясферы і стварае умовы, неабходныя для існавання чалавецтва. Змены балансу Э.р., што узнікаюць у выніку выкарыстання іх чалавекам ва ўсё большых маштабах у вытв-сці і інш., у выніку прыродных катастроф (землетрасенні, навадненні, засухі і інш.) могуць весці да *катастрофы* экалагічнай ці *крызісу экалагічнага* .

**ЭКАЛАГІ́ЧНЫЯ ФА́КТАРЫ**, элементы асяроддзя, якія неабходны арганізму ці адмоўна на яго уплываюць. Падзяляюцца на *біятычныя фактары* (драпежнікі, паразіты і інш.), *абіятычныя фактары* (т-ра, вільготнасць, святло і інш.) і антрапагенныя ці антрапічныя Э.ф. (гл. *Антрапагеннае уздзеянне*). Для кожнага Э.ф. у віду існуюць межы вынослівасці. Віды з шырокімі межамі вынослівасці, якія маюць вял. *экалагічную валентнасць*, — *эўрыбіёнты*, віды з вузкім дыяпазонам Э.ф. — *стэнабіёнты*. Найб. спрыяльная для жыццядзейнасці арганізма інтэнсіўнасць Э.ф. — экалагічны оптымум, найб. неспрыяльная — *экалагічны песімум*. Оптымум і межы вынослівасці арганізма у дачыненні да аднаго Э.ф. залежаць ад інш. уздзеянняў. Напр., у раслін пры аптымальнай т-ры павялічваецца устойлівасць да неспрыяльнай вільготнасці, недахопу жыўлення; у жывёл мноства корму павялічвае устойлівасць да кліматычных умоў. Э.ф., узровень якіх выходзіць за межы вынослівасці віду, — лімітуючыя Э.ф., — робяць немагчымым існаванне віду ў пэўнай *экасістэме*. Напр., нізкая канцэнтрацыя кіслароду ў вадаёмах — лі-